# РАЗДЕЛ 5. КОНФЕССИОНАЛЬНЫЕ ОСОБЕННОСТИ БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЕЛЬ: ПОВСЕДНЕВНОСТЬ И КОНФЛИКТЫ

*Заблоцкая Т. М.*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*Zablotskaya T.*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94:37(476.6)“18”**

## ПРАЦЭС ЗАКРЫЦЦЯ НАВУЧАЛЬНЫХ І ДАБРАЧЫННЫХ УСТАНОЎ ОРДЭНА ПІЯРАЎ ЛІТОЎСКАЙ ПРАВІНЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1830–1840 ГАДАХ

## THE PROCESS OF CLOSING EDUCATIONAL AND CHARITABLE INSTITUTIONS OF THE ORDER OF PIARISTS OF THE LITHUANIAN PROVINCE IN THE TERRITORY OF GRODNO PROVINCE IN 1830–1840

*Паўстанне 1830–1831 гг. змяніла падыход расійскай улады да каталіцкай царквы ў цэлым, асабліва да дзейнасці кляштараў у Заходняй частцы Беларусі. Прадстаўнікі расійскай улады лічылі, што каталіцкія кляштары з’яўляюцца цэнтрамі апазіцыйных сіл, якія былі абвінавачаны ва ўдзеле ў паўстанні. Сярод удзельнікаў вылучаецца каталіцкае духавенства (ксяндзы, манахі). Напачатку расійская адміністрацыя шукала магчымасць да паслаблення ўплыву каталіцкай царквы ў Заходніх губернях і падначалення дзейнасці каталіцкага духавенства сваім інтарэсам. Аднак загад ад 19 ліпеня 1832 г. распачаў «масштабную антимонастырскую кампанию». У Гродзенскай губерні было зачынена 17 каталіцкіх кляштараў, у тым ліку Ордэна піяраў у Шчучыне. На працягу 1832–1834 гг. адбыўся шэраг пакаранняў, якія былі накіраваны, галоўным чынам, супраць існуючай сістэмы польска-каталіцкай адукацыі.*
*Ключавыя словы: Расійская імперыя; Гродзенская губерня; каталіцкія кляштары; Ордэн піяраў; павятовае вучылішча.*

*The rebellion of 1830–1831 changed the approach of Russian authorities to the catholic church, especially to the activity of monasteries in the western part of Belarus. The Russian authorities believed that catholic monasteries were the centers of opposition forces that were accused of participating in the rebellion. The catholic clergy (priests, monks) stands among the participants. At the beginning, the Russian administration was looking for an opportunity to weaken the influence of the catholic church in the western provinces and to subordinate the activity of the catholic clergy to their interests. However, the order dated July 19, 1832 began a large campaign against monasteries. Seventeen catholic monasteries were closed in Grodno province including the Order of piarists in Schuchin. During the 1832–1834, the series of punishments followed, which were directed mainly against the existing system of polish-catholic education.*
*Keywords: Russian empire; Grodno province; catholic monasteries; the Order of piarists; county school.*

Пасля далучэння тэрыторыі беларускіх зямель да Расійскай імперыі пачалі выпрацоўвацца зыходныя палажэнні дзяржаўнай палітыкі ў галіне народнай асветы. Паводле Статута 1804 г., сістэма адукацыі будавалася на прынцыпе адзінства і пераемнасці, назіраўся рост свецкай адукацыі, у навучальныя планы ўводзіліся прыродазнаўчыя дысцыпліны.

Рэформа сістэмы адукацыі не прадухіліла ў навучальных установах беларускіх зямель каталіцкага ўплыву. Распрацаваная ў мінулыя стагоддзі манаскімі ордэнамі сістэма адукацыі садзейнічала павышэнню эфектыўнасці навучання. На беларускіх землях працавалі навучальныя ўстановы піяраў, базыльян, даміініканцаў, місіянераў, канонікаў рэгулярных і інш.

У першай трэці XIX ст. найбольш актыўна манаскія вучылішчы працавалі ў Заходняй Беларусі, дзе здолелі заняць пануючае месца ў галіне адукацыі. У Гродзенскай губерні «налічвалася 7 павятовых вучылішчаў, якія ўтрымліваліся манашаскімі Ордэнамі: дамініканцамі ў Гродна і Навагрудку, базыльянамі ў Жыровіцах, канонікамі лютэранскімі ў Слоніме, піярамі ў Шчучыне і Лідзе, місіянерамі ў Ваўкавыску» [15]. Такім чынам, панаванне манаскай адукацыі над свецкай цалкам задавальняла кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі, утворанай у 1803 г.

Свае пазіцыі ў школьнай справе захаваў каталіцкі Ордэн піяраў. Аб гэтым сведчыць колькасць навучальных устаноў на 1817 г. у межах Віленскай навучальнай акругі: Віленская губерня – у Расіенах, Вількаміры, Панявежжы; Гродзенская губерня – у Шчучыне, Лідзе; Беластоцкая вобласць – у Драгічыне; Мінская губерня – у Лужках, Любяшове; Валынская губерня – у Дамбровіцы, Мендзыжэччы; Віцебская губерня – у Віцебску [18, л. 152]. Навучальныя ўстановы знаходзіліся ў межах сучаснай тэрыторыі Літвы, Беларусі, Правабярэжнай Украіны.

Істотных змен у становішчы навучальных устаноў Ордэна піяраў пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі не назіралася. Толькі першапачатковая назва навучальняў Ордэна піяраў «калегіум» была зменена на назву «павятовае вучылішча». Неабходна адзначыць, што перайменаванне назвы навучальнай установы ніякім чынам не адбілася на праграме навучання, вучэбным працэсе, мове выкладання і на складзе выкладчыкаў.

Значныя змены ў сістэме адукацыі Віленскай навучальнай акругі адбыліся пасля паўстання 1830–1831 гг., у якім актыўна прынялі ўдзел не толькі шляхта, студэнты і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта, але і ксяндзы, манахі рымска-каталіцкіх кляштараў, у тым ліку і манахі Ордэна піяраў. У даследаваннях В. В. Гарбачовай падаюцца дадзеныя сацыяльнага складу ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі, якія паказваць, што каталіцкае, праваслаўнае і уніяцкае духавенства складала 5,4 % ад агульнай колькасці паўстанцаў [2, л. 127].

Расійскі імператар Мікалай I адзначыў: «...прошла пора великодушия; неблагодарность поляков сделала его невозможным, и на будущее время во всех сделках, касающихся Польши, всё должно быть подчинено истинным интересам России» [3].

У 1831 г. былі прыняты першыя рашэнні з улікам «истинных интересов». Са складу Віленскай навучальнай акругі былі выведзены тры губерні: Мінская губерня пераведзена ў Беларускую навучальную акругу, Падольская і Валынская губерні – у Харкаўскую навучальную акругу. Услед адбылося закрыццё 1 мая 1832 г. Віленскага ўніверсітэта і скасаванне Віленскай навучальнай акругі.

Расійская адміністрацыя шукала магчымасць да паслаблення ўплыву каталіцкай царквы ў заходніх губернях і падначалення дзейнасці каталіцкага духавенства сваім інтарэсам. Аднак загад Мікалая I ад 19 ліпеня 1832 г. распачаў «масштабную антимонастырскую кампанию». Ён загадаў «…объявить немедленно Римско-католической коллегии и главным местным начальствам Западных губерний об упразднении некомплектных монастырей, как лишенных средств к поддержанию порядка и благочиния между монашеством» [1, с. 121].

Зыходзячы з загаду закрываліся некамплектныя кляштары, якія былі малаколькаснымі па штаце. Па кананічных правілах у кожным кляштары павінна было знаходзіцца не менш за 9 манахаў. У перапісцы ад 12 жніўня 1832 г. віленскі ваенны губернатар і «исправляющий» пасаду гродзенскага і беластоцкага генерал-губернатара М. А. Даўгарукі адзначае гродзенскаму грамадзянскаму губернатару М. Н. Мураўёву, што «…в Римско-католических монастырях “Западных губерний”, большею частью издавна уже замечается недостаток контингента монахов» [5, арк. 1].

Міністр унутраных спраў Д. Н. Блудаў падае прапановы па пытаннях уладкавання каталіцкіх кляштараў ад імя імператара Мікалая I спадару Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі да «належнага іх выканання» [5, арк. 7–10]:

1. Для лепшага ўладкавання «благочиния» ў кляштарах, а таксама для ўстанаўлення найбліжэйшага нагляду над манаскім духавенствам прадаставіць поўную ўладу Епархіяльным епіскапам над кляштарамі на дакладнай аснове пастаноў 1798 г.: ад 28 красавіка 2О бытии в России для исповедующих Римскую веру шести диоцезий…» і «Регламента для церквей и монастырей Римско-католического исповедания в Российской Империи» ад 3 кастрычніка, ускласці на іх адказнасць і галоўны нагляд за кіраваннем фундушамі, якія знаходзяцца ў кляштарах іх епархій.

2. Скасаваць неадкладна ўсе некамплектныя кляштары як пазбаўленныя сродкаў да падтрымання парадку і «благочиния» паміж манаштвам, вызначыўшы пайменна асаблівы вопіс усіх кляштараў, якія прызначаны да скасавання. Выключыць з агульнага правіла тыя кляштары, якія ўяўляюць большую ці меншую зручнасць да размяшчэння манахаў з іншых скасаваных кляштараў.

3. Скасаваць таксама кляштары, якія знаходзяцца пасярод пасяленняў грэка-расійскай і ўніяцкай цэркваў, у прыходах якіх манахі чужога выканання не могуць быць запатрабаванымі для выканання духоўных патрэб.

4. Манахаў са скасаваных кляштараў перавесці ў іншыя кляштары іх Ордэнаў.

5. Цэрквы скасаваных кляштараў, да якіх прылічаны парафіі, ператварыць, на меркаванне мясцовага грамадзянскага начальства і з дазволу міністра ўнутраных спраў, у простыя прыхадскія, філіяльныя, але не інакш. У адваротным выпадку ператварыць разам з іншымі кляштарнымі збудаваннямі да агульнакарысных устаноў.

6. Калі кляштарныя цэрквы застаюцца ў Беларусі і паўднёвых губернях, начальнікам губерняў строга прытрымлівацца пастановы 1795 г., дадзенай на імя беларускага генерал-губернатара П. Б. Пасэка, якой было вызначана, што на 1 святара на невялікай прасторы – не менш чым 100 двароў, а на 2 святароў – не менш чым 200 двароў (жыхары павінны мець свае дамы ці іншую нерухомую маёмасць).

7. Парадак вызначэння святароў парафій, устаноўлены ў 1831 г. для Самагіцкай епархіі, у сакавіку 1832 г. распаўсюджваецца на ўсе іншыя рымска-каталіцкія і грэка-уніяцкія епархіі, прыняць і цяпер пры назначэнні да цэркваў скасаванных кляштараў, у якіх права кцітарства павінна належаць казне.

8. Аб'яднаныя з фундушамі скасаваных кляштараў абавязкі пакінуць пры цэрквах, якія пераўтвараюцца ў парафіяльныя, калі абавязкі могуць быць выкананы і белым духавенствам. Прадвызначана загадам 1795 г. У супрацлеглым выпадку фундушавыя абавязкі перавесці разам з манахамі ў іншы кляштар.

9. Грашовыя капіталы, якія належаць скасаваным кляштарам, далучыць да агульнага дапаможнага рымска-каталіцкага духавенства і назначыць з іх сумы на задавальненне патрэб Рымска-каталіцкай царквы.

10. Нерухомыя маёнткі і іншую ўласнасць скасаваных манастыроў перадаць у кіраванне казне дзеля таго, каб даход з іх быў пераведзены на богаўгодныя ўстановы, асабліва на заснаванне павятовых вучылішч замест тых, якія цяпер утрымліваюцца пры скасаваных кляштарах.

11. Аб богаўгодных установах і вучылішчах, прыналежных да скасаваных кляштараў, аддаць распараджэнне: па першых – мясцоваму духоўнаму начальству, па-другіх – Міністэрству народнай асветы. Будынкі скасаваных кляштараў, за выключэннем памяшканняў святароў пры цэрквах, ператворанных ў парафіяльныя, ператварыць ва ўстановы агульнага карыстання, пакінуць у кожнай епархіі адзін кляштар для патрэб самога духавенства, а менавіта для састарэлых святароў.

Згодна з загадам расійскія ўлады праводзяць перапіс колькасці рымска-каталіцкіх і грэка-уніяцкіх манастыроў, якія знаходзяцца ў Гродзенскай губерні. Са звестак, прадстаўленых віленскім епіскапам А. Б. Клангевічам на сакавік 1832 г., становіцца вядома, што ў павятовым вучылішчы г. Ліды налічваецца 7 манахаў і 58 вучняў, а ў шчучынскай навучальнай установе піяраў – 12 манахаў і 104 вучні [8, арк. 8–8 адв.].

Таксама распачалася расійская «кампанія» па выяўленні «неблаганадзейных» манахаў, якія маглі мець дачыненне да паўстання 1830–1831 гг. З архіўных матэрыялаў з НГАБ у г. Гродна становіцца вядома не толькі пра паводзіны асобных манахаў, але і магчыма вызначыць колькасны склад манастыроў Ордэна піяраў у м. Шчучын і г. Лідзе.

У кляштары Ордэна піяраў у мястэчку Шчучын вызначаны пайменны спіс у колькасці 12 асоб: рэктар манастыра Антон Закржэўскі, наглядчык вучылішча Яцэк Румяноўскі, Андрэй Запольскі, Карл Маліноўскі; настаўнікі: Антон Казлякоўскі, Ювеналіс Тамашэвіч, Банавентура Пяткевіч; настаўнікі-клірыкі: Вікенцій Палуян, Якаў Кучан, Фама Семяновіч, Юзаф Станіслаўскі [9, арк. 55 адв. – 56]. Да дадзенага спісу шчучынскіх піяраў, згодна з ведамасцю аб колькасці кляштараў на тэрыторыі Гродзенскай губерні, неабходна далучыць манаха Юзафа Каласанты Лукевіча, які знаходзіўся для выканання духоўных патрэб у фальварку Акопы, што ў Зэльве Ваўкавыскага павета [9, арк. 27 адв.].

Павятовае вучылішча Ордэна піяраў у г. Ліда налічвала 7 манахаў, аднак пайменны спіс паведамляе пра 9 асоб: рэктар манастыра – Антоні Паеўскі, Фердынанд Шумборскі – наглядчык (прэфект), прыбыў з Віленскага піярскага манастыра 4 кастрычніка 1831 г., Фадзей (Тадэвуш) Внятоўскі – хрысціянская навука, Іосіф Кабылянскі – лацінская і польская мовы, Антоні Ясінскі – французская мова, гісторыя, Гіпаліт Дабравольскі – арыфметыка, геаметрыя, Піус Ясенскі – руская мова, геаграфія, Палікарп Заленскі – памочнік, Юзаф Каласанты Багуцкі – арыфметыка, геаметрыя, нямецкая мова [9, арк. 53]. У мястэчку Жырмуны Лідскага павета пры парафіяльным касцёле знаходзіліся два манахі-піяры з кляштара г. Ліды – святар Каласанты Санкоўскі і вікарый Юзаф Сангайла [9, арк. 58].

Што датычыцца спісу «неблаганадзейных манахаў», то ў ім адзначаюцца паводзіны кожнага манаха з кляштара ў Шчучыне і Лідзе: са шчучынскага кляштара быў адзначаны Андрэй Запольскі, які 11 чэрвеня 1831 г. па сакрэтнай справе быў запатрабаваны маёрам жандармаў Г. Ожыгавым. Аднак, па нявызначаных матывах паводзін, А. Запольскі скрыўся, але 28 чэрвеня рэктарам Антоні Закржэўскім быў выданы паліцыі і адпраўлены ў г. Гродна, дзе пад арыштам у жніўні таго ж года памёр [9, арк. 55 адв. – 56].

Сярод манахаў каталіцкага Ордэна піяраў «неблаганадзейным» у Лідскім павятовым вучылішчы быў вызначаны Юзаф Каласанты Багуцкі (былы наглядчык вучылішча). Так, як ён ужо «до прибытия мятежников скрывал зловредные намерения», а калі ў Ліду прыбыў невялікі атрад паўстанцаў у маі 1831 г. на чале з генералам Д. Хлапоўскім, ён далучыўся да іх і больш не вярнуўся [9, арк. 53 адв.].

Дакладна не ўстаноўлена, што з'явілася прычынай закрыцця Шчучынскага павятовага вучылішча і скасавання кляштара манахаўпіяраў: ці навучальня не адпавядала колькаснаму штату манахаў, а можа лёс прадвызначыў кляштару Ордэна піяраў у мястэчку Шчучын апынуцца ў спісе «сямнаццаці рымска-каталіцкіх кляштараў», якія былі прапанаваны віленскім ваенным губернатарам і «исправляющим» пасаду гродзенскага і беластоцкага генерал-губернатара М. А. Даўгарукім да закрыцця ў Гродзенскай губерні.

Справа аб скасаванні Шчучынскага манастыра была распачата ў верасні 1832 г. [13]. З рапарта расійскага чыноўніка Якава Бараноўскага становіцца вядома, што да шчучынскага кляштара адносіліся «новы касцёл, двухпавярховы мураваны будынак кляштара і тры асобныя драўляныя дамы, аптэка, фруктовы сад у 1 дзесяціну, агароды і 10,5 моргаў зямлі» [13, арк. 10 – 12].

З архіўных матэрыялаў становіцца вядома, як выглядалі дамы: першы меў «6 пакояў, 2 кухні, 3 кладоўкі, 2 скляпенні, 11 вокнаў ды 2 дзвярэй, быў крыты гонтамі»; другі налічваў «4 пакоі, 1 кухню, 1 кладоўку, 1 скляпенне, 10 вокнаў ды 1 дзверы, быў крыты саломай»; трэці меў «5 пакояў, 11 вокнаў ды 1 дзверы, быў крыты саломай» [13, арк. 10 адв.]. Два першыя дамы здаваліся ў арэнду розным асобам, якія размяшчалі ў іх вучняў вучылішча за плату 1 руб срэбрам. У год атрымоўвалася 100 рублёў срэбрам. З нагоды закрыцця манастыра адышлі арандатары па прычыне заканчэння тэрміну кантрактаў. Толькі ўдава Ганна Дзерангова «выказала жаданне арандаваць два пакоі на 8 месяцаў, выплочваючы па 1 рублю срэбрам» [13, арк. 11адв.].

На 1832 г. піяры валодалі маёнткам Радзевічы, які быў здадзены ў арэнду. Фальварак Акопы ў Ваўкавыскім павеце заўсёды належаў да шчучынскага кляштара яшчэ па запісу 1739 г. князя Сапегі на карысць першага правінцыяла Літоўскай правінцыі, але з нагоды скасавання шчучынскага кляштара быў таксама перададзены ў загадванне казне [7, арк. 204 адв. – 205].

Разам з манастырскімі збудаваннямі была секвестравана і аптэка манахаў-піяраў. 2 верасня 1832 г. гродзенскі грамадзянскі губернатар М. Н. Мураўёў даручыў Гродзенскай казённай палаце прыняць аптэку ў мястэчку Шчучын Лідскага павета ў казённае ведамства [12, арк. 1адв.].

Камісія ў складзе з аператарам Гродзенскай медычнай управы А. Ф. Савічам была камандзіравана ў мястэчка Шчучын дзеля складання вопісу і ацэнкі ўсіх медыкаментаў, матэрыялаў, посуду і іншых рэчаў, якія знаходзіліся ў аптэцы айцоў-піяраў. З рапарта Я. Бараноўскага за № 6 ад 14 верасня 1832 г. становіцца вядома, што «шчучынская аптэка прынята ў казну і складзены яе падрабязныя вопісы» [12, арк. 12], а менавіта:

1. Аптэчных матэрыялаў, якія знаходзіліся ў Шчучынскай аптэцы, прыналежнай піярскаму манастыру [12, арк. 20–34].

2. Вопіс посуду, знойдзенага ў шчучынскай аптэцы [12, арк. 34 аб. – 37 адв.].

3. Поўны вопіс аптэчных матэрыялаў і посуду, якія знаходзіліся ў аптэцы манахаў-піяраў, знаходзіцца ў гістарычным архіве ў г. Гродна [12].

Пасля прыняцця ў казённае ведамства аптэка працавала пад наглядам аптэкара І. М. Іваноўскага. У ёй працягваўся продаж лекаў і медыкаментаў. І. М. Іваноўскаму была дадзена шнураваная кніга для ўліку прыходу грошай, якія паступалі ад продажу. За 2 тыдні (з 29 жніўня 1832 г. па 14 верасня 1832 г.) паступіла 79 рублёў [12, арк. 12].

22 лютага 1833 г. па распараджэнні Міністэрства фінансаў выдаецца пастанова «Аб продажы шчучынскай аптэкі», згодна з якой аптэку скасаванага піярскага манастыра вырашана прадаць з публічных таргоў [12, арк. 39].

Камісіяй, якая была камандзіравана для складання падрабязнага вопісу аптэчных матэрыялаў і посуду, праведзена «ацэнка як медыкаментаў, так і ўсёй маёмасці ў той аптэцы» [12, арк. 40]. Медыкаменты, посуд і іншая маёмасць аптэкі былі ацэнены гродзенскай медычнай управай у 2337 руб. 9 кап. асігнацыямі.

Продаж аптэкі быў назначаны на 5 чэрвеня 1833 г., у мястэчку Шчучын, аператаргі – на 12 чэрвеня 1833 г. у губернскім г. Гродна. Жаданне набыць аптэку выказалі: князь Францішак Ксаверый Друцкі-Любецкі (у асобе паверанага памочніка князя Пятра Бернацкага) і аптэкар І. М. Іваноўскі.

Як сведчыць гандлёвы ліст ад 5 чэрвеня 1833 г., таргі адбыліся ў мястэчку Шчучын. І. М. Іваноўся падчас таргоў адмовіўся ад удзелу ў таргах даператаргоў, якія былі назначаны на 12 чэрвеня 1833 г.Ператаргі адбыліся ў гродзенскай казённай палаце, дзе прысутнічалі П. Бернацкі (паверані князя Ф. К. Друцкага-Любецкага) і аптэкар І. М. Іваноўскі.

Згодна з гандлёвым лістомператаргоў, аптэка скасаванага манастыра Ордэна піяраў была куплена Пятром Бернацкім за 2,925 рублі асігнацыямі [12, арк. 140].

Збудаванні касцёла айцоў-піяраў у мястэчку Шчучын планавалася пакінуць у статусе «парафіяльнай царквы» і даручыць кіраванне ёю вызначанаму святару, а збудаванне кляштараператварыць для размяшчэння ў ім састарэлых святароў, усе фундушавыя абавязкі пакінуць пры дадзеным касцёле [6, л. 133].

Вучні зачыненага павятовага вучылішча былі пераведзены ў Ліду. Аднак ужо 1832/1833 на-


132.
КВИТАНЦІЯ
Казначейство
19 Октября 1833 года
безъ платежа за бумагу.
№ Кн. 2486
№ Ст. 2791
По Указу ЕГО ИМПЕРАТОРСКАГО ВЕЛИЧЕСТВА дана сія квитанція, въ томъ, что сего числа принято въ означенное Казначейство

*Мал. 1.* **Спіс манахаў манастыра Ордэна піяраў у г. Ліда на 11 красавіка 1842 год.**
Крыніца: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 1. – Воп. 20. – Спр. 934. – Списки монахов Гродненской губернии. 24.03.1842–11.02.1843. – Арк. 26 (усяго ў справе 61 арк.)


26
Списокъ Монаховъ ордена Піаровъ

*Мал. 2.* **Квітанцыя ад 19 кастрычніка 1833 года аб выплаце грашовых сродкаў у казначэйства г. Гродна Пятром Бернацкім у памеры 2925 рублёў асігнацыямі за аптэку Ордэна піяраў у м. Шчучын.**
Крыніца: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 31. – Воп. 2. – Спр. 85. – Дело о передаче в казённое ведомство аптеки в местечке Шчучин Лидского уезда в связи с упразднением Шчучинского пиарского монастыря. – 03.09.1832–08.05.1858. – Арк. 132 ( усяго ў справе 157 арк.)

вучальны год быў апошнім і ў дзейнасці Лідскай навучальні, канчатковай датай закрыцця павятовага вучылішча манахаў-піяраў лічыцца 2 верасня 1834 г. [4, s. 87].

Манахі-піяры заставаліся ў Лідзе на працягу 10 гадоў. Вядома, што ў 1840 г. пляцы, якімі валодалі манахі ў цэнры горада Ліды, былі здадзены імі ў арэнду [11, арк. 27].

Пра тое, што манахі-піяры яшчэ 11 красавіка 1842 г. былі ў Лідзе, становіцца вядома з рапарта лідскага гараднічага да гродзенскага губернатара Г. Г. Дапельмаера, у якім ён прыкладае спіс манахаў Піярскага манастыра [10, арк. 26].

*Табліца 1*

**Спіс манахаў-піяраў на 1842 год**

| Імя і прозвішча манахаў, якія прынеслі зарок | Пасада | Месца прыбывання |
|---|---|---|
| Юзаф Вайшвіла | настаяцель, кансультор і прапаведнік | у манастыры |
| Фадзей Малюкевіч | асістэнт канцылярыста | у манастыры |
| Антоні Закржэўскі | настаяцель | у Рожанцы |
| Юзаф Сангайла | вікарый | у Осаве |
| Юзаф Лукевіч | вікарый | у Зэльве |
| Юзаф Барташэвіч | бібліятэкар | у манастыры |
| Мікалай Бальцэвіч | настаяцель | у Ішчальні |
| Інакенцій Дзялакоўскі | філіяліст | у Балінгродзе |
| Антоні Ясінскі | адміністратар | у Начы |
| Фама Семяновіч | вікарый | у Беняконях |
| Станіслаў Леановіч | вікарый | у Жалудку |
| Ян Богатыровіч | адміністратар | у Жалудку |
| Юзаф Якукевіч | вікарый | у Ражанцы |

Такім чынам, навучальная ўстанова піяраў у Лідзе ўжо не існавала, але манахі выконвалі парафіяльныя абавязкі пры розных касцёлах.

23 жніўня 1842 г. у Лідзе адбыўся пажар, у выніку якога была пашкоджана частка касцёла Ордэна піяраў [17, арк. 99]. Расійскія ўлады распачынаюць перадачу збудавання Лідскага піярскага рымска-каталіцкага касцёла ў ведамства праваслаўнага духавенства для перабудавання яго ў праваслаўную царкву, а збудаванне кляштара – у дваранскае вучылішча [11]. Канчаткова Ордэн піяраў ліквідаваны ў Лідзе 14 мая 1845 г. І толькі ў 1848 г. пакінуў сваю абіцель апошні рэктар лідскай навучальні – Юзаф Вайшвіла.

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. урад распачаў рэарганізацыю ўсёй сістэмы адукацыі ў Гродзенскай губерні. Паводле праведзеных мерапрыемстваў царскага ўрада, павятовае вучылішча Ордэна піяраў у мястэчку Шчучын было зачынена, а Лідскае павятовае вучылішчаператворана спачатку ў мяшчанскае вучылішча (канец 1834 г. – па лістапад 1835 г.), а пасля – у 5-класнае дваранскае павятовае вучылішча (1835–1858 гг.) [16].

Палітыка па ліквідацыі манаскай адукацыі, як увогуле ў дачыненні да каталіцкіх манаскіх ордэнаў, так і да Ордэна піяраў, будзе працягнута расійскімі ўладамі. Заставаўся фармальны акт скасавання Ордэна піяраў: у 1843 г. Літоўская правінцыя Ордэна піяраў была ліквідавана (толькі кляштар айцоў-піяраў у Мендзыжэччы праіснуе да 1853 г.) [14, p. 271].

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Вибе, И. Н.* Католические монастыри в политике российской власти в Западном крае (1831–1832) [Электронный ресурс] / И. Н. Вибе // Известия Российского государственного педагогического университета имени А. И. Герцена. Аспирантские тетради [Текст]. – СПб., 2008. – № 32(70), ч.1. – Режим доступа: https://lib.herzen.spb.ru/m/rgpu-periodic/1/148. – Дата доступа: 24.09.2018.

2. *Гарбачова, В. В.* Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: бібліяграфічны слоўнік / В. В. Гарбачова; [навук. рэд. У. І. Навіцкі]. – Мінск: БДУ, 2004. – 400 с.

3. *Зайончковский, А. М.* Восточная война 1853–1856 гг. [Электронный ресурс] / А. М. Зайончковский // Литература и жизнь. – Режим доступа: http://dugward.ru/library/nikolay1/zayonchkovskiy1.html. – Дата доступа: 15.10.2018.

4. *Kurkowski, J.* Pijarzy w Werenowie i Lidzie (1735–1845) / J. Kurkowski // Z dziejow Ziemi Lidzkiej. – Warszawa: Retro-Art, 1997. – S. 55–131.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ у Гродна). – Ф. 1. – Воп. 27. – Спр. 233. Дело об упразднении семнадцати Римско-католических монастырей в Гродненской губернии. 16.08.1832–02.09.1832. – 171 л.

6. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. – Воп. 27. – Спр. 234. Дело об упразднении семнадцати Римско-католических монастырей в Гродненской губернии. 02.09.1832–30.09.1832. – 400 л.

7. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. – Воп. 27. – Спр. 235. Дело об упразднении семнадцати Римско-католических монастырей в Гродненской губернии. 01.10.1832–05.04.1834. – 447 л.

8. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 1238. Ведомости о количестве монастырей в Гродненской губернии. 28.02.1831–24.03.1831. – 15 л.

9. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. – Воп. 3. – Спр. 1239. Дело о доставлении собранных подробных сведениях о поведении Римско-католических и греко-униятских священников и монахов во время бывшего мятежа. 28.12.1831–25.06.1831. – 151 л.

10. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 20. – Воп. 20. – Спр. 934. Списки монахов Гродненской губерни. 24.03.1842–11.02.1843. – 61л.

11. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 20. – Воп. 3. – Спр. 2186. Дело о передаче здания Лидского пиарского римско-католического костёла в ведение православного духавенства для переделки в церковь. 03.04.1843–06.09.1848. – 49 л.

12. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 31. – Воп. 2. – Спр. 85. Дело о передаче в казённое ведомство аптеки в местечке Шчучин Лидского уезда в связи с упразднением Шчучинского пиарского монастыря. 03.09.1832–08.05.1858. – 157 л.

13. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 31. – Воп. 2. – Спр. 91. Дело об упразднении Щучинского пиарского монастыря Лидского уезда. 19.09.1832–11.08.1838. – 17 л.

14. *Picanyol, L.* Brevis conspectus historico-statisticus ordinis Scholarum Piarum. – Roma: Apud curiam generalitiam PP. Scolopi di S. Pantaleo, 1932. – 318 p.

15. *Сливкин, В. В.* Учебные заведения Лидского уезда [Электронный ресурс] / В. В. Сливкин. – Режим доступа: http://www.lida.info/uchebnye-zavedeniya-lidskogo-uezda/. – Дата доступа: 01.10.2018.

16. *Сливкин, В. В.* Учебные заведения Лидского уезда. Лидское уездное дворянское училище [Электронный ресурс] / В. В. Сливкин. – Режим доступа: http://www.lida.info/uchebnye-zavedeniya-lidskogo-uezda-lidskoe-uezdnoe-dvoryanskoe-uchilishhe/. – Дата доступа: 01.10.2018.

17. *Сліўкін, В. В.* Лідчына ў 1830–1850-я гады / В. В. Сліўкін // Памяць: Ліда. Лідскі раён: Гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: В. Г. Баранаў [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2001. – 592 с.

18. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 733. – Оп. 62. – Д. 375. Отчёт о состоянии Виленского университета, гимназий, уездных и приходских училищ и конвиктов за 1817 год. 24.09.1818. – 256 л.

**Дата паступлення: 15.11.2018.**

*Кароль М. М.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*Karol M.*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476)“1905/1917”**

## АДЛЮСТРАВАННЕ МІЖКАНФЕСІЙНЫХ ПЕРАХОДАЎ У ПЕРЫЯДЫЧНЫМ ДРУКУ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

## IMAGE OF RELIGIOUS CONVERSIONS IN THE PRESS OF THE BELARUSIAN PROVINCES IN THE BEGINNING OF 20TH CENTURY

*У артыкуле разглядаюцца тэндэнцыі, якія былі характэрны для перыядычнага друку featureрознай палітычнай, этнічнай і канфесійнай скіраванасці ў пачатку XX ст. пры асвятленні рэлігійнай сітуацыі, якая склалася пасля выдання 17 красавіка 1905 г. Указа аб асновах верацярпімасці. Акрэсліваюцца і характарызуюцца асноўныя адрозненні ў падачы інфармацыі пра пераходы з праваслаўя ў каталіцызм, стаўленне насельніцтва да змен у канфесійным становішчы.*

*Ключавыя словы: верацярпімасць; рэлігійная канверсія; Указ ад 17 красавіка 1905 г.; перыядычны друк; праваслаўе; каталіцызм; празелітызм.*

*The article discusses on trends, which were characterized of periodicals of various political, ethnic, and confessional orientations in the beginning of 20th century after the publication on April 17, 1905 of the Decree on the religious tolerance. The main differences in the presentation of information about the conversions from Orthodoxy to Catholicism, about the attitude of the population to a new religious situation are determined and characterized.*

*Keywords: religious tolerance; religious conversion; Decree of April 17, 1905; press; Orthodoxy; Catholicism; proselytism.*

Пачатак XX ст. прынёс кардынальныя змены ў рэлігійнае жыццё Расійскай імперыі. Указ аб асновах верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г. (далей – Указ аб верацярпімасці) абвясціў свабоду веравызнання і адмяніў крымінальную адказнасць за пераход з праваслаўя ў іншую веру. Дадзеная падзея атрымала шырокі розгалас сярод сучаснікаў, у першую чаргу ў тагачаснай прэсе. Мэта дадзенага артыкула – прасачыць, як адлюстроўвалася прыняцце і рэалізацыя Указа аб верацярпімасці на старонках газет рознай палітычнай накіраванасці.

Перш за ўсё звернемся да «Епархіяльных ведамасцей», якія з’яўляліся афіцыйным друкаваным органам праваслаўных епархій на тэрыторыі Беларусі. Адзначым, што ў пераважнай большасці праваслаўнае духавенства крытычна аднеслася да абвяшчэння Указа аб верацярпімасці, бо бачыла ў ім пагрозу для панавання праваслаўя ў беларускіх губернях, што ў будучым магло прывесці да памяншэння колькасці вернікаў.

Рэдакцыі «Епархіяльных ведамасцей» апаратыўна адрэагавалі на абвяшчэнне Указа аб верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г. Яшчэ да афіцыйнага выхаду Указа ў № 8 «Мінскіх епархіяльных ведамасцей» ад 15 красавіка 1905 г. аўтар А. Тавараў прысвяціў артыкул «Западнорусские православные братства и предстоящие им задачи деятельности, в связи с вопросом о признании свободы вероисповедания»[1], раскрыццю мэт і задач царкоўных брацтваў ва ўмовах абвяшчэння рэлігійнай талерантнасці. На думку аўтара, абвяшчэнне свабоды сумлення прывядзе да ўзрастання пагрозы для праваслаўя з боку каталіцкай рэлігіі [1, с. 169]. У выніку паслабленняў у рэлігійнай палітыцы любая «вера [...] варожая праваслаўю [...] атрымлівае права адкрыта сябе вызнаваць, не баючыся адказнасці перад законам» [1, с. 160]. У такім выпадку праваслаўная царква, якая раней знаходзілася пад апекай дзяржавы і закона, пасля Указа застаецца «безабароннай перад ударамі ворагаў» [1, с. 165]. Пры гэтым А. Тавараў менавіта тэрыторыю Беларусі лічыў найбольш «неабароненай», дзе «вора-

[1] Другая частка артыкула была надрукавана 1 мая.